БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 16 (98)
май
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Шчасця!

с.2

Работа

с.3

Разам

с.4

Пасада

с.5

Закон

с.8

KAMUNIKAT.org

Шчасця вам, Вольга і Эран!

З далёкага, але адначасова і блізкага нам ізраільскага горада Хайфа прыйшла прыемная навіна: 3 сакавіка адбылося вяселле нашай Вольгі Паршнёвай. Яна больш за дзесяць гадоў жыве ў прыгожым горадзе, які раскінуўся на беразе Міжземнага мора. Працуе па спецыяльнасці, якую атрымала ў Магілёве -- поварам. А замуж пайшла за Эрана Эсаля -- уладальніка сеткі мясцовых піццэрый.

Раіса і Святаслаў Паршнёвы -- бацькі Вольгі -- негледзячы на дальні авіапералёт, засталіся вельмі задаволеныя адбыўшымися урачыстасцямі.

МЯ

Фота-здымкі з сямейнага архіва Вольгі і Эрана ЭСАЛЬ

Глыток рытуальнага віна...

А гэта шлюбная дамова -- **ктуба**

Тры сястры

Шапачка на галаве С.Паршнёва -- **кіпа**

Бацькі і дзеці: Раіса, Таццяна, Вольга, Алена і Святаслаў

КАМПІКТ.org

Каб парадак быў

Амат намаганняў патрабуе амаль кожны дзень брылеўскае наваколле. Работнікі мясцовага ўчастка "Жылкамгаса" на чале з А.М.Сілковым імкнуцца, каб наша вёска была прыгожая, каб тут заўсёды быў добраўрападкаваны выгляд. На змену ручным косам прыйшлі механізаваныя прыстасаванні, і ўсе мы рэгулярна чуем іхнія галасы ля сваіх дамоў. Калі патрабуецца нешта больш ма-

Уладзімір Аляксандравіч Іваноў і Аляксандр Мікалаевіч Сілкоў

Міхаіл Уладзіміравіч Лысянкоў

гутнае, кіраўніцтва раённага "Жылкамгаса" накіроўвае ў Брылі адпаведную тэхніку. Напрыклад, некалькі майскіх дзён запар літаральна стогадовыя залежы смецця ля дамоў па вуліцы Юбілейнай у Брылях выграбаў спецыялізаваны аўтапагрузчык "Беларус", якім кіраваў камандзіраваны М.У.Лысянкоў. Дзякуючы стараннай працы гэтага маладога хлопца змяніўся, можна сказаць, нават ландшафт нашага гарадка.

Па словах майстра ўчастка А.М.Сілкова, мэтанакіраваная праца такога кшталту на брылеўскай тэрыторыі будзе працягвацца і надалей. Калі спатрэбіцца -- будуць задзейнічаны ўсе неабходныя тэхнічныя сродкі. Бо навядзенне парадку на зямлі -- гэта не прыгожае словазлучэнне, а карпатлівая штодзённая работа.

Мікола ЯЦКОЎ.

Аляксандр Генадзьевіч Мяшкоў

Агульная справа

Участковы Магілёўскага РАУС Валерый Васільевіч Маскалёў заўсёды працуе ў цеснай сувязі з выканкамам Брылеўскага сельсавета. Звяртаючыся сюды па неабходных пытаннях, ён ведае, што заўсёды атрымае тут кваліфікаваную дапамогу. У памяшканні сельсавета у ўчастковага ёсць свой пакой для правядзення асабістага прыёму грамадзян у вызначаныя дні. Усё зроблена дзеля таго, каб наблізіць працу праваахоўных органаў да людзей, і каб гэтая агульная з мясцовай уладай справа набывала новую станоўчую дынаміку.

В.В.Маскалёў і сакратар выканкама Брылеўскага сельскага Савета Н.І.Рамашкевіч абмяркоўваюць надзённыя пытанні.

Скрыжаванне

Калі рабілі знакамітую дарогу, якая звязала брылеўскія вуліцы Першамайскую, Кастрычніцкую і Палявую, ніхто не думаў, што з'явіцца новая праблема: скрыжаванне гэтай дарогі з вуліцай Палявой ператварылася ў амаль непралазнае пясчанае "балота". Мясцовыя жыхары неаднаразова звярталі ўвагу ўладаў на гэтую акалічнасць, але пакуль што пэўных зрухаў няма.

Памочнікі

Як жа ўсё-ткі добра, што вясковыя дзеці з самога маленства дапамагаюць сваім бацькам у няпростай сялянскай працы!.. Вось глядзіце: такая малеча -- а прымае актыўны удзел у такой няпростай справе, як завесці карову ў хлеў пасля яе вяртання з выпасу.

Брылеўскія аколіцы

МОГИЛЕВСКАЯ ПРАВДА

29 мая 2009 г.

Поножовщиной закончилось выяснение отношений между односельчанами в деревне Кадино Могилёвского района.

Вечером 22 мая 42-летний ранее судимый местный житель вышел прогуляться по деревне. Встретил односельчанина. Из-за чего началась ссора между ними, сказать трудно. Но итог «разборок» страшный: 53-летний мужчина получил около 20 ножевых ранений, от которых скончался на месте. Подозреваемый в убийстве задержан. Могилёвской райпрокуратурой возбуждено уголовное дело.

Наш чалавек

З суседняй вёскі Кадзіна прыйшла прыемная навіна: 18 мая 2009 года на пасаду старшыні выканкама Кадзінскага Сельскага Савета заступіў Віктар Міхайлавіч ВАСКАБОЙНІКАЎ. Брылеўцы ведаюць яго вельмі добра, бо ў свой час ён працаваў у калгасе імя Ільіча сакратаром партыйнай арганізацыі. А што гэта была за праца і чым тады займаўся парторг можна даведацца, пагартаўшы пажоўклыя старонкі нашай "раёнкі"...

За камуністычную ПРАЦУ

З добрай весткай

26 мая 1987 года

Дзе павінен знаходзіцца зараз важак пярвічнай парт-арганізацыі? Вядома, там, дзе рашаецца лёс планаў і абавязацельстваў, дзе працуюць людзі, - на веснавым полі. Так лічыць сакратар партбюро калгаса імя Ільіча Віктар Міхайлавіч Васкабойнікаў. Ён ведае, калі трэба чалавека падбадзёрыць добрым словам, каго павіншаваць з перамогай, а каго пракантраляваць. Заўсёды раскажа працаўнікам, што робіцца ў свеце, у калгасе, хто ідзе сёння наперадзе.

Участак, на якім працуе член КПСС механізатар Леанід Андрэевіч Баранаў (ён наразае барозны пад бульбу), парторг наведаў, каб перадаць камуністу, што раніцай ля канторы ў яго гонар узнялі сцяг працоўнай славы, і падзякваць за добрую работу. У той час і зроблен гэты здымак.

Г. РАДКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКУ:
В.М. Васкабойнікаў (справа) і Л.А.Баранаў.

Фота С. ТРАЦЭЎСКАГА.

Пасля Брылёў Віктар Міхайлавіч працаваў у аграфірме "Днепр" на розных важных пасадах. І, раз-пораз сустракаючыся з ім на працягу гэтых гадоў, магу адзначыць, што якім ён і быў -- сур'ёзным, дапытлівым, дабразычлівым і ўважлівым -- такім і застаўся. А гэтыя якасці, як мне падаецца, абавязкова дапамогуць яму на новай, вельмі адказнай пасадзе.

Віншуем, Віктар Міхайлавіч!

Мікола ЯЦКОЎ.

Рыбацкае шчасце

Апошнім часам рыбачыць на нашу Рудэю едуць адусюль. Нельга сказаць, што ўловы тут выключныя, але ж, здаецца, кожны знаходзіць тут сваё рыбацкае шчасце...

Кніганоша

Слова *"кніганоша"*, якое ло вельмі актуальным у 30-я гады мінулага стагоддзя, запатрабавана і сёння. Гэтым словам абазначаецца значная частка работы Брылеўскай сельскай бібліятэкі, бо кніга павінна ісці да людзей. Таму новыя выданні па папярэдняй дамоўленасці рэгулярна дастаўляюцца па месцу жыхарства і на рабочыя месцы нашых чытачоў.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.
Фотаздымак М.Яцкова *(8.05.2009 г.).*

Таццяна Яўгенаўна Фралова і Тамара Фёдараўна Прудзікава -- актыўныя чытачы.

Багіра і Любоў

Калі выдаецца свабодная хвіліна, жыхарка Брылёў Любоў Якаўлеўна Пухаленка любіць сядзець на слончыку ў сваім двары. І амаль заўсёды да яе далучаецца суседская кошка Багіра. Аб чым яны размаўляюць, мы не ведаем, але ясна бачна, што сяброўскія адносіны тут вельмі трывалыя.

Фота М.Яцкова (15.05.2009 г.)

Сустрэча

-- Ты хто?

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

Аргументы и факты

№ 18, 2009 г.

Данііл Гранін

Вядомы расійскі пісьменнік Данііл ГРАНІН разважае пра надзённае:

«...Совесть, её наличие или нехватка -- качество индивидуальное. Но в целом в обществе её явно не хватает. Многие научились договариваться со своей совестью. Ведь как рассуждают некоторые люди: все вокруг воруют. Воруют наверху, депутаты берут взятки, и министры берут, и мэры городов берут, и милиция берёт. А я что, хуже? Нет, я тоже так могу. Удобная индульгенция.

...К культуре сегодня относятся пренебрежительно. В правительстве говорят так: «Сначала надо обустроить ЖКХ, медицину, образование, а потом уже будем заниматься театрами, книгами, музеями». Опасный путь. Такая практика отучает человека от культуры».

Цытата

Сябар -- гэта той чалавек, які ведае пра вас усё, але не перастае пры гэтым любіць вас.

Элберт ХАБАРТ.

Народная газета

20.05.2009 г.

Курение убивает каждого десятого человека в мире. В Беларуси от болезней, связанных с курением, ежегодно умирает 15,5 тысячи человек. С курением связано 30-40% всех случаев смерти от ишемической болезни сердца, 30% -- от онкологических заболеваний, причём 97% заболевших раком лёгкого являлись активными курильщиками. В настоящее время курит треть взрослого населения страны -- более 50% мужчин и свыше 10% женщин.

Звязда

22.04.2009 г.

ПАДКОВА

Па павер'ях нашых продкаў, падкова сімвалізавала шчасце і поспех, уяўляючы сабою магутны абярэг ад дрэннага вока і нячыстай сілы. Абавязковая ўмова -- падкову трэба знайсці на дарозе.

- Адна з прычын, чаму падкова стала знакам шчасця і ўдачы, была ў тым, што ў ранейшыя часы багатыя людзі падковы сваім любімым рысакам рабілі не толькі з жалеза, але і са срэбра, а бывала, і з золата. Здаралася, што даволі дарагія падковы губляліся. А той, хто знаходзіў такую падкову, раптоўна станавіўся багатым чалавекам.
- Падкову надзялялі ўласцівасцямі ахоўнага характару. Лічылася, што ў хату, над парогам якой вісіць падкова, ніколі не трапіць нячыстая сіла.
- Нярэдка падкову выкарыстоўвалі ў магічных дзеяннях. Напрыклад, каб вылечыць хворага, які пакутуе ад жорсткага рэўматызму, раілі пад матрац яму пакласці дзве старыя падковы -- адну ў галаве, другую ў нагах, але канцамі ўнутр, і сказаць: *"Раней па зямлі білі, а зараз каб раба (імя) абаранілі. Амін".*
- Рыбакі ў мэтах бяспекі свайго судна прыбівалі падкову на мачце.
- Існавала наступнае паданне аб магічных уласцівасцях падковы: калі знойдзеную на дарозе падкову кінуць праз левае плячо і задумаць жаданне, яно абавязкова спраўдзіцца.

Аргументы и факты

№ 21, 2009 г.

ПРАЗДНИК СО СЛЕЗАМИ НА ГЛАЗАХ

Когда стала известна сумма затрат на русское «Евровидение» -- примерно 50 млн. долларов, у людей возник закономерный вопрос: чем хотели удивить? Как всегда, «хитрее всех» оказалась Белоруссия. Победил их парень Александр Рыбак, но... от имени Норвегии! То есть слава белорусам, а материальные проблемы -- Норвегии в следующем году.

На деньги, потраченные на организацию русского «Евровидения» можно было:

- ► построить 100 начинённых самым высокотехнологическим оборудованием школ;
- ► оборудовать качелями, песочницами и горками 10.000 детских площадок;
- ► провести 10.000 сложнейших операций по шунтированию сердца.

ПЕРВЫЙ... ПЕРВЫЕ... ВПЕРВЫЕ

ЧТО произошло на белорусской земле впервые? В чём белорусы были первыми?

ПЕРВЫЙ ДОКУМЕНТАЛЬНЫЙ СБОРНИК.

В 1824 году в Москве в типографии С.И.Селивановского издан **первый сборник документов по истории белорусских земель,** подготовленный протоиереем гомельской Петропавловской церкви Иваном Григоровичем.

ПЕРВАЯ САНСТАНЦИЯ.

29 октября 1922 года в Гомеле была торжественно открыта **первая в СССР санитарно-эпидемиологическая станция** под руководством Константина Кононовича.

ПЕРВАЯ ФУТБОЛЬНАЯ КОМАНДА.

В 1910 г. в Гомель на работу приехал один из сильнейших футболистов юга России А.Либман. Он стал основателем и капитаном **первой футбольной команды на территории Беларуси.**

Даказаць віну

Рэпліка

Магілёўская раённая газета “Прыдняпроўская ніва” 20 мая 2009 года надрукавала аб’яву Магілёўскага раённага аддзела ўнутраных спраў аб вышуку людзей. Увагу прыцягнула менавіта гэтая аб’ява, бо, па-першае, гаворка тут ідзе аб нашай аднавясковіцы Таццяне Дзмітрыеўне Макарэвіч, жыхаркі в.Качурына.



Милиция просит помощи:

Могилевским РОВД разыскивается скрывшаяся преступница Макаревич Татьяна Дмитриевна, 12.07.1985 года рождения, уроженка д. Березовка Тамалинского района Пензенской области Российской Федерации, жительница д. Качурино Могилевского района, которая совершила преступление, предусмотренное ст. 210 ч. 1 УК Республики Беларусь (завладение имуществом, совершенное должностным лицом с использованием своих служебных полномочий), после чего скрылась от следствия.

Гражданам, располагающим какими-либо сведениями о местонахождении Макаревич Т.Д. просим сообщить по т.т. 22-15-92, 22-73-02, 22-70-69 или 102.

Анонимность гарантируется.

МАЯ

ПРЫДНЯПРОЎСКАЯ НІВА

Могилевским РОВД разыскивается скрывшаяся преступница Макаревич Татьяна

А па-другое, мне вельмі не спадабалася ўжыванне слова ***“преступница”*** у дачыненні да Т. Д. Макарэвіч.

За кансультацыяй я звярнуўся да вядомага беларускага юрыста, былога следчага па асабліва важных справах Юрыя Паўлавіча ТАПАРАШАВА. І вось што ён адказаў: *«То, что я увидел в “Прыдняпроўскай ніве” -- вещь абсолютна недопустимая. Потому что суда не было, а раз не было суда, то и не было приговора, вступившего в законную силу. А если нет такого приговора, то ваша Татьяна Макаревич является невиновной и ни в коем случае не может именоваться «преступницей». Тем более публично через средства массовой информации. Здесь или умышленно, или по незнанию нарушен основной принцип уголовного производства -- презумпция невиновности. И Макаревич, в принципе, может выставить газете судебный иск о защите чести и достоинства. И могу вас уверить, что в данном случае суд будет на стороне этой женщины, потому что газета обязана проверять достоверность публикуемых материалов».*

Ю.П.Тапарашаў

Каб чытачам “Брылеўскага летапісу” было зразумела што такое *«презумпция невиновности»*, давайте зазірнём у адпаведны раздзел “Юрыдычнай энцыклапедыі” (*http://studentbooks.com.ua*) :

«Презумпция невиновности -- предположение, согласно которому лицо считается невиновным, пока его виновность не будет доказана и установлена вступившим в законную силу приговором суда.

Содержание принципа презумпции невиновности:

1) подозреваемый или обвиняемый не обязан доказывать свою невиновность;

2) бремя доказывания обвинения и опровержения доводов, приводимых в защиту подозреваемого или обвиняемого, лежит на стороне обвинения;

3) все сомнения в виновности обвиняемого толкуются в пользу обвиняемого;

4) обвинительный приговор не может быть основан на предположениях.

Презумпция невиновности требует от органов, осуществляющих уголовное судопроизводство, и от других лиц -- относиться к человеку, чья вина в совершении преступления не доказана во вступившем в законную силу приговоре, как к невиновному.

Презумпция невиновности опровергается только путем доказывания установленными процессуальными средствами и лишь при наличии достаточных судебных доказательств. Отход в сторону от презумпции невиновности ведет к нарушению законности в правосудии и ущемлению прав граждан».

У святле ўсяго вышэйсказанага хочацца параіць“раёнцы”: будзьце больш уважлівымі да людзей, якіх узгадваеце, і да тых матэрыялаў, якія публікуеце.

“БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС”
Выдаецца з мая 2006 г.
Магілёўскае рэгіянальнае выданне.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікола ЯЦКОЎ
Пры перадруку матэрыялаў спасылка на “Брылеўскі летапіс” абавязковая.
© “Брылеўскі летапіс”, 2009

Звярстана і надрукавана на хатнім абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com